Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 23 (714) • Пятніца, 21 чэрвеня 1968 г. • Год выдання XXI Цана 2 кап.



Ні дома ў інтэрнаце, ні ў вучэбнай аўдыторыі і нават у ціхім скверы не дае студэнтам спакою экзаменацыйная сесія.

Фота І. Аскіркі.

## АПОШНЯЕ ВЫПРАБАВАННЕ

Чырвоныя макі і ружы ўпрыгожваюць стол дзяржаўнай камісіі. У кабінеце друку абставіны сур'ёзнай напружанасці і адказнасці. Тут ужо другі дзень студэнты - выпускнікі аддзялення журналістыкі завочнага факультэта здаюць адзін з самых складаных і цікавых экзаменаў — гісторыю ...шавіцкага друку.

У суровых умовах падполля нараджалася газетнае слова, каб данесці да прыгнечанага народа ідэі марксізма, разбудзіць у ім свядомы кірунак рэвалюцыйнай барацьбы, даказаць нецярпімасць царызма і магчымасць пабудовы новага грамадства.

Першыя вынікі парадавалі і дзяржаўную камісію і саміх выпускнікоў. На самыя складаныя пытанні палітычнай барацьбы, пытанні з гераічнага і мужнага жыцця У. І. Леніна, публіцыстаў яго школы студэнты даюць грунтоўныя адказы. Віктар Пятрушын, Мікола Латыш здаюць свой апошні экзамен выдатна. Тамара Новікава і многія іншыя атрымліваюць добрыя адзнакі.

Адным з важных і складаных фактараў экзамена з'яўляецца вывучэнне вялікай літаратурна-публіцыстычнай спадчыны Леніна, Лепяшынскага, Луначарскага, Альмінскага — усіх тых, хто стаяў каля вытокаў партыйнай публіцыстыкі, хто распрацоўваў і праводзіў у жыццё тэорыю сацыялістычнай рэвалюцыі, хто адстойваў марксізм у барацьбе з апартунізмам у Расіі і на міжнароднай арэне.

У білеты экзамена ўключана шмат пытанняў па вывучэнню публіцыстычнага майстэрства ленінскіх работ. Для пачынаючага журналіста гэта пастаянная школа газетнай працы.

Члены камісіі дэкан факультэта журналістыкі Р. В. Булацкі, загадчык кафедры журналістыкі ВПШ Напрэеў, дактары гістарычных навук В. А. Пыжкоў і А. Е. Жураў высока ацанілі веды дырэктара музыкальнай школы Вікенція Куніцкага. Грунтоўна падрыхтаваўся да экзамена былы аграном, а цяпер намеснік рэдактара раённай газеты Уладзімір Смоляр.

— У асноўным да свайго апошняга экзамена студэнты падрыхтаваліся добра, — сказаў Р. В. Булацкі, — гэта як бы апошняя праверка не толькі ведаў выпускнікоў, але і праверка іх ідэйна-палітычнай загартоўкі. І вельмі прыкра, што не ўсе рыхтаваліся да экзамена сур'ёзна...

Сапраўды не ўсе вытрымалі апошняе выпрабаванне. Хана Гарохава атрымала нездавальняючую адзнаку. Тым не менш у светлым зале кабінета друку адбываецца ўрачысты акт, які будуць заўсёды з пяшчотным сумам успамінаць людзі, што назаўсёды пакідаюць сцены універсітэта, студэнцкія хваляванні і радасці, людзі, якіх У. І. Ленін заклікаў «пісаць гісторыю сучаснасці».

С. АЛЕГАЎ.

## СПРАВАЗДАЧА ХІМІКАЎ

Сесія ў самым разгары, але вось весткі аб выніках экзаменаў цяжка здабыць на хімфаку нават у дэканаце. Маўляў, выкладчыкі носяць з сабой экзаменацыйныя ведамасці. Таму мы вырашылі ўзяць факты непасрэдна на экзамене. На шчасце, доўга шукаць не прыйшлося.

Дацэнт Галіна Ігнатаўна Васільева прымала экзамен па неарганічнай хіміі ў студэнтаў першага курса.

За сталамі, на якіх многа кветак, рыхтуюцца да адказу студэнты, выкладваюць на чыстую паперу свае думкі, тое што чыталі, тое, што запісвалі раней. Яны ўсе задуменыя, не звяртаюць увагі ні на кветкі, ні на яркае чэрвеньскае сонца.

Амаль усе ў групе праэкзаменаваны, і можна было зрабіць некаторыя вывады. Галіна Ігнатаўна называе прозвішчы тых, каму толькі што паставіла ў залікоўку «выдатна». Гэта студэнты Г. Пятроўскі, Е. Рагоцкая, М. Пяцігораў. А. Белановіч.

— У гэтым семестры студэнты пятай і шостай груп першага курса падрыхтаваліся да экзамена па неарганічнай хіміі значна лепш,—гаворыць Г. І. Васільева.—І першы экзамен па фізіцы яны здалі няблага. Можна спадзявацца, што гэтыя групы летнюю сесію закончаць з лепшымі вынікамі, чым першую, зімовую.

Эдуард Веніямінавіч Паваркоў, які нядаўна прымаў экзамен па аналітычнай хіміі ў студэнтаў другога курса хімфака, таксама задаволены адказамі. Усяго здавалі 287 чалавек. З гэтага ліку 80 атрымалі «выдатна» і толькі чатыры «нездавальняюча». Лепшыя адзнакі атрымалі студэнты В. Баранава, Н. Самахвалава, А. Скрыпчанка і многія іншыя.

А. САГАЎ.



У розных кутках Беларусі знойдуць прымяненне сваім ведам маладыя спецыялісты.

Перад дзяржаўнай камісіяй давалі справаздачу нядаўна выпускнікі юрыдычнага факультэта.

Цяпер пуцёўка ў працоўнае жыццё атрымана.
Фота І. АСКІРКІ.

### ГАРТАЮЧЫ СТАРОНКІ ДЫПЛОМНЫХ

## НЕЎМІРУЧЫ ДУХ САЛІДАРНАСЦІ

У гісторыі нашай Радзімы ёсць нямала цудоўных старонак, упісаных магутным рухам пралетарскай салідарнасці. Адна з іх паўстае перад вачыма, калі знаёмішся з дыпломнай работай студэнта-завочніка філасофскага аддзялення нашага універсітэта Віктара Іванавіча Колесава. Прадметам яго даследавання стала развіццё форм інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных у сумеснай барацьбе народаў Савецкай Расіі і Германіі за перамогу сацыялістычнай рэвалюцыі ў 1917—1922 гадах.

Аўтар на працягу некалькіх год захоплена працаваў над гэтай тэмай, вывучыў вялікую колькасць матэрыялаў. У час службы ў радах Савецкай Арміі на тэрыторыі ГДР В. І. Колесаў працягваў свае пошукі ў нямецкіх бібліятэках, азнаёміўся з некаторымі архіўнымі матэрыяламі. Каб выкарыстаць навейшыя даныя, дыпламант пераклаў з нямецкай мовы трэці том «Гісторыі нямецкага рабочага руху» аб'ёмам у 450 старонак. Сустракаючыся з былымі чырвонагвардзейцамі і чырвонаармейцамі, ветэранамі нямецкага рабочага руху, ён зрабіў цікавыя запісы, якія затым выкарыстаў у дыпломнай рабоце.

Гартаючы старонкі гэтага цікавага даследавання, мы з хваляваннем і гонарам учытваемся ў радкі, якія гавораць аб прыцягваючай сіле пралетарскай рэвалюцыі, аб вялікім інтэрнацыянальным братэрстве лепшых прадстаўнікоў розных народаў.

«... Тысячы грамадзян Германіі ўжо ў першыя дні Кастрычніцкай рэвалюцыі са зброяй у руках змагаліся плячом к пляча з працоўнымі Расіі за перамогу Савецкай улады. Чырвонаармеец Ганс Манхарт удзельнічаў у штурме Зімняга, там жа, у Петраградзе, вызначыўся ў баях супраць юнкераў Франц Клінгер. Сярод паўстанцаў-рабочых Уладзівастока быў селянін з Потсдама Эрнст Радон... У Барнауле ў ліку чырвонагвардзейцаў, што ўстанаўлівалі Савецкую ўладу, быў 25-гадовы нямецкі ваеннапалонны Отта Морыц». На барыкадах Луганска мужна змагаўся з белаказакамі Густаў Фольгман. Храбрым салдатам паказаў сябе Марцін Дэкерт. Пазней за актыўны ўдзел у баях супраць белагвардзейцаў і іншаземных інтэрвентаў яму было прысвоена ганаровае званне «Чырвоны кулямётчык». Да гэтай пары працоўныя беларускага горада Слуцка памятаюць чырвонагвардзейца Альфрэда Барке, які вызначыўся не толькі ў Слуцку, але і ў іншых месцах Беларусі... Цікавым з'яўляецца даследаванне аўтарам новых форм пралетарскай салідарнасці, народжаных іменна ў першай пераможнай сацыялістычнай рэвалюцыі, і іх развіццё аж да нашых дзён.

Адзначаючы навуковую каштоўнасць працы, рэцэнзенты аднадушна рэкамендавалі яе да апублікавання.

У водгуку на дыпломную работу студэнта ўдзельнік Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны на Беларусі Альфрэд Адольфавіч Барке, узнагароджаны ў мінулым годзе ордэнам Чырвонай Зоркі, піша: «...Лічу, што даная работа адкрые невядомую старонку ў разгортванні грамадзянскай вайны на тэрыторыі Беларусі.

Вывучэнне гэтай тэмы... паслужыць умацаванню дружбы і ўзаемаразумення паміж двума нашымі брацкімі народамі — нямецкім і Савецкай Беларусі..., умацаванню і далейшаму развіццю пралетарскай салідарнасці паміж нашымі народамі».

А. НІКОЛЕНКА.

# ДЗЯКУЙ ТАБЕ, САВЕЦКІ НАРОД!

## ГЕРАІЗМ— ТЭМА САЧЫНЕННЯЎ

*У канцы навучальнага года выкладчыкі кафедры рускай мовы правялі конкурс сярод замежных студэнтаў асноўных факультэтаў на тэму гераізма савецкага народа. Змест кожнага сачынення паказвае, што студэнты шмат чаго ведаюць аб нашай краіне, аб вялікім савецкім народзе, яго велічных подзвігах у гады вайны і на фронце мірнага будаўніцтва. Вялікае ўражанне на замежных студэнтаў зрабілі экскурсіі ў Брэсцкую крэпасць-герой і Дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны, кінафільмы. Нейкі налёт нацыянальнага каларыту, пяшчотнай дзявочай душэўнасці адчуваецца ў сачыненні в'етнамскай студэнткі I курса фізфака Ле Тхі Оань, якая займаецца ў групе выкладчыка кафедры рускай мовы Анны Францаўны Гусак. Кожны замежны студэнт па-свойму раскрывае тэму, па-свойму выказвае свае пачуцці і адносіны да нашай рэчаіснасці, дзеліцца сваімі ўражаннямі аб пачутым ці ўбачаным ў нашай краіне. Часам замежным сябрам не хапае патрэбных слоў, каб больш трапна выказаць свае думкі — руская мова надзвычай вялікая, багатая, і не адразу авалодаеш усім яе багаццем, эмацыянальным харастком, сілай выразнасці кожнага слова. Але ўсе студэнты сыходзяцца ў галоўным — гераізм савецкіх людзей мае выключнае значэнне, бо ён вырашыў лёс не толькі нашай краіны. Бяспрыкладныя подзвігі савецкіх людзей натхняюць сёння многія народы на барацьбу за сваё нацыянальнае разняволенне, за мір, дэмакратыю і сацыяльны прагрэс.*

*Сёння мы друкуем два сачыненні аб гераізме савецкага народа студэнтаў першага курса фізфака нашага іniверсітэта з групы старшага выкладчыка кафедры рускай мовы Аляксандры Віктараўны Куцэнка в'етнамца Хо Нгок Чонга і афганца Абдула Гафура Султані.*

## ПІСЬМО З В'ЕТНАМА

Мне пісьмо! Я вельмі ўзрадаваўся. Яно было ад маёй сяброўкі-студэнткі з В'етнама. Я з задавальненнем пачаў чытаць. Кожнае пісьмо з Радзімы прыносіць мне апошнія навіны.

Мая сяброўка вучыцца ў педагагічным інстытуце на літаратурным факультэце. Вось што яна расказала.

«Сёння нядзеля. Сонца толькі што выплыла з-за далёкіх гор, яно пасылае на зямлю першыя свае прамені. Вее цёплы приемны вецер. Неба блакітнае і светлае. Пяюць птушкі. Так пачынаецца вясенняя раніца!

А цяпер я раскажу табе, як я жыву і вучуся. Аднойчы вечарам я была ў садзе, палівала агародніну. Раптам у небе з'явіліся амерыканскія самалёты. Я толькі паспела спусціцца ў сховішча, як шарыкавыя бомбы ўпалі на сад і ўсё знішчылі. Але вось два самалёты загарэліся і ўпалі на зямлю. Іх збілі мясцовыя зенітныя брыгады. Амерыканскія захопнікі заплацілі жыццём за сваё варварства. І хоць бамбардыроўкі часта перашкаджаюць нам, мы добра вучымся. Кожны дзень мы не толькі рыхтуемся да заняткаў, але і авалодваем ваеннай справай. У нас ёсць зенітныя атрады, узброеныя магутнай тэхнікай. Яны паспяхова змагаюцца з амерыканскімі агрэсарамі. У гэтым навучальным годзе мы былі цэлы месяц на ваенных трэніроўках і многаму навучыліся. Часта да нас прыязджаюць госці. Яны расказваюць аб падзеях у свеце, апошніх навінах. Па-бацькоўску клапоціцца аб нас урад, ён дае нам усё неабходнае для вучобы: стыпендыі, кнігі, прадукты. І мы стараемся аддзякаваць за гэтыя клопаты выдатнай вучобай, спаборнічаючы адзін з другім. Святы мы праводзілі вельмі весела са сваімі сябрамі і роднымі.

А як ты жывеш у братняй краіне? Як вучышся? Напішы. Я чакаю.

Твая сяброўка».

Як жа я вучуся? Ва універсітэце я пастаянна адчуваю гарачыя клопаты ўсіх выкладчыкаў і савецкіх сяброў. Я ездзіў на інтэрнацыянальныя вечары, на экскурсіі на заводы і ў школы. Я быў на камвольным камбінаце, на трактарным заводзе, пазнаёміўся з рабочымі і работніцамі. Пабываў у школе-інтэрнаце, у Палацы піянераў. Гэтыя экскурсіі пакінулі ў мяне вялікае ўражанне. Там, дзе я бываў, мяне сустракалі па-брацку. Увесь савецкі народ садзейнічае в'етнамскаму народу ў барацьбе супраць амерыканскіх агрэсараў.

Я дзякую ўвесь савецкі народ за дапамогу в'етнамскаму народу. Вялікае дзякуй усім выкладчыкам, якія добра дапамагаюць нам у вучобе і жыцці.

НГУЕН ДЫК ХЬЕН,
студэнт падрыхтоўчага факультэта.



Наталля Міхайлаўна Кантроўская — удзельніца абароны Брэсцкай крэпасці — сярод в'етнамскіх студэнтаў падрыхтоўчага факультэта ў цытадэлі.

Фота Я. Данілава.

## КРЭПАСЦЬ З ЛЕГЕНДЫ

Сапраўды, вельмі цікава, калі мара чалавека збываецца, і ён знаходзіцца як у сне.

Я ўпершыню пачуў аб Брэсце і яго абаронцах яшчэ дома ў Афганістане. Тады я думаў, што такія крэпасці існуюць толькі ў раманах і легендах. «Чаму ж моцная гітлераўская армія, добра ўзброеная і навучаная, так доўга не магла захапіць крэпасць?»—пытаў я ў самога сябе.

Але калі я ўбачыў крэпасць і аднаго з яе абаронцаў, я зразумеў, што гераізм савецкіх людзей яшчэ вышэй, чым я думаў.

Мы паехалі ў Брэст на аўтобусе. У дарозе мы спявалі, жартавалі, смяяліся, глядзелі ў акно, захапляліся зялёнымі палямі Беларусі. Было так прыгожа, што мне здалося: зямля не чорная, а зялёная. Вечарам мы прыехалі ў Брэст і размясціліся ў інтэрнаце інжынерна-будаўнічага інстытута. Чамусьці мне хацелася, каб хутчэй прайшла ноч, каб хутчэй убачыць легендарную крэпасць. Раніцай, калі я ўстаў, на вуліцы быў густы туман, навокал нічога не было відаць. Нягледзячы на тое, што можна было заблудзіцца, я пайшоў гуляць па гэтым горадзе.

Знік туман, і раптам я ўбачыў чыстае блакітнае неба і пачуў спевы птушак. Пастаяўшы на месце, я пайшоў па вуліцы і ўпершыню сустрэў жыхара гэтага горада. Гэта быў стары гадоў 70. Мы прывіталіся, ён палічыў мяне за ўзбека і спытаў: «Ну, як Узбекістан?»—Я адказаў: «Прыгожы». «А з якога ж горада, з Ташкента?»—распытваў ён далей. Я не хацеў больш хлусіць і адказаў, што я іншаземец. Стары даў руку і сказаў: «Калі б усе людзі розных краін сустракаліся так, як мы, з усмешкай і жартамі, было б вельмі добра».

Мы доўга размаўлялі з ім, ён расказаў мне многа цікавага. Пасля я пайшоў у інтэрнат, і потым разам з сябрамі мы паехалі ў Брэсцкую крэпасць.

Прыгожае зялёнае месца, блакітнае сонечнае неба, рака, якая цячэ праз крэпасць,—усё гэта ўяўлялася жывой карцінай, створанай добрым мастаком.

Пасля мы пайшлі ў музей, дзе знаходзяцца каштоўнейшыя дакументы вайны, якія сведчаць аб гераізме савецкіх людзей. У музеі экскурсавод пазнаёміў нас з крэпасцю і яе героямі. Сярод нас знаходзіцца абаронца крэпасці, ён расказаў нам пра сваіх сяброў, з якімі ваяваў і якія аддалі жыццё за шчасце свайго народа.

Потым мы пайшлі ў заходнюю частку крэпасці. Тут мы ўбачылі яе разбураныя падвалы. Я жыва ўявіў сабе тое, што было тут у час вайны. На сценах захаваліся надпісы. «Памром, але не здадзімся». Людзі даказалі, што волю і імкненне да свабоды не можа знішчыць ніякая зброя, ніякі агонь.

У час экскурсіі мы пабывалі ў лесе, агледзелі месца, дзе фашысты забілі некалькі соцен мірных людзей. Пасля такой экскурсіі думаеш: «Як было б добра, калі б на ўсёй зямлі быў мір, і людзі заўсёды сустракалі адзін другога з радаснымі ўсмешкамі і цёплымі словамі».

АБДУЛ ГАФУР СУЛТАНІ.

## БЕССМЯРОТНЫ ПРЫКЛАД

Гераізм савецкага народа... Гэта цікавая тэма, але нялёгка яе раскрыць у невялікім сачыненні. Чаму? Ды таму, што гэты гераізм нараджаўся ў барацьбе мужнага савецкага народа за новае жыццё, у барацьбе за захаванне заваёў новага сацыялістычнага ладу.

Яшчэ ў паўднёва-в'етнамскіх джунглях мне давялося чуць пра дзяўчыну Зою, якая загінула смерцю героя ў барацьбе за вызваленне Савецкай Радзімы. Але Зоя ніколі не загіне — яе імя у сэрцы кожнага савецкага чалавека, у думках народа, які любіць свабоду і незалежнасць. Памяць аб ёй шануе і в'етнамскі народ. Я памятаю, як аднойчы вечарам пад адкрытым небам у джунглях мы, партызаны Паўднёвага В'етнама, гаварылі пра яе подзвіг, пра яе жыццё. І на наступны дзень мы пайшлі ў бой нібы з новымі сіламі. Зоя Касмадзям'янская — цудоўны прыклад для партызан В'етнама. Яна жыве і разам з намі.

Кажуць., што музей — гэта вялікая люстра, у якім можна ўбачыць гісторыю ўсёй краіны або асобны перыяд гісторыі аднаго народа. Хто хоча даведацца аб мінулым аднаго народа, той павінен наведаць гістарычны музей гэтага народа. Вось чаму я з радасцю наведаў Музей гісторыі Айчыннай вайны БССР. Мне гэтага даўно хацелася. Будынак-музей — вялікі і сучасны, створаны беларускімі архітэктарамі і будаўнікамі. Тут я пазнаёміўся з гісторыяй Беларусі, пазнаў многа цікавага аб рэспубліцы, яе народзе, зразумеў, як жылі савецкія людзі да вайны. Даведаўся я, што ў той жа час, калі свабодна і мірна жылі народы СССР, у фашысцкай Германіі гітлераўцы рыхтаваліся да нападу на Савецкі Саюз і іншыя краіны.

Жыццё беларускага народа ў час акупацыі гітлераўцамі было вельмі цяжкім. Пакутавалі жанчыны, дзеці, старыя. Але ўвесь беларускі народ, як і ўсе савецкія людзі, падняўся на абарону сацыялістычнай краіны. Усе згуртоўваліся вакол Камуністычнай партыі і пад яе кіраўніцтвам змагаліся за вызваленне Радзімы. Кожны савецкі грамадзянін быў воінам. Нягледзячы на тое, што ў гітлераўцаў было многа зброі, сучасная тэхніка, вораг быў пераможаны.

Савецкая ўлада выхавала ў савецкіх людзей вялікую і гарачую любоў да сваёй сацыялістычнай краіны. Людзі ведалі цану свабоднага жыцця і таму не хацелі жыць у рабстве нават кароткі час. Такі народ нельга перамагчы.

Вялікая Айчынная вайна выявіла вельмі многа герояў. У музеі я даведаўся аб некаторых. Адны з іх загінулі, некаторыя засталіся жывымі. Але загінуўшыя назаўсёды засталіся жывымі ў сэрцах людзей.

Я з зацікаўленасцю знаёміўся з палажэннем у тыле і на фронце гэтай вайны. Усюды савецкія людзі працавалі не ведаючы адпачынку. Заводы і фабрыкі працавалі цэлымі суткамі. «Усё для фронта, усё для перамогі, смерць ворагам!» — усюды можна было прачытаць гэтыя словы. Гітлераўцы цярпелі адно паражэнне за другім.

Экскурсія ў музей аказала на мяне вялікае ўражанне. Я думаю аб сваёй Радзіме, дзе цяпер наш народ змагаецца супраць амерыканскіх захопнікаў, як раней савецкі народ падняўся на абарону сваёй Радзімы. Ён не адзінокі ў сваёй барацьбе, з ім савецкі народ, народы сацыялістычных краін і ўсё прагрэсіўнае чалавецтва. Таму я цвёрда ўпэўнены— мы пераможам!

ХО НГОК ЧОНГ.

